# Злучальныя і падпарадкавальныя злучнікі, іх ужыванне (7 клас)

**І. У. Чарановіч,**
настаўніца беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай катэгорыі
Варацэвіцкага вучэбна-педагагічнага комплексу
дзіцячы сад – сярэдняя школа Іванаўскага раёна

***Мэты ўрока:*** стварыць педагагічныя ўмовы для азнаямлення вучняў з сутнасцю падзелу злучнікаў на злучальныя і падпарадкавальныя, для засваення ведаў аб ужыванні іх у маўленні; садзейнічаць фарміраванню ў вучняў уменняў распазнаваць злучнікі ў тэкстах, вызначаць іх ролю, правільна выбіраць злучнікі ў адпаведнасці са значэннем і стылістычнай афарбоўкай; выкарыстоўваць у вусным і пісьмовым маўленні; удасканальваць уменне ўзаемакантролю, самакантролю, самаацэнкі, самакарэкцыі дзейнасці; развіваць лагічнае, творчае мысленне вучняў праз выкарыстанне такіх прыёмаў разумовай дзейнасці, як аналіз, сінтэз, параўнанне; фарміраваць цікавасць да вучэбных дзеянняў, любоў да родных мясцін, пачуццё гонару за свайго славутага земляка.

***Тып урока:*** урок вывучэння новага матэрыялу.

***Абсталяванне:*** Г.М.Валочка, С.А.Язерская. Вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. – Мн: Нацыянальны інстытут адукацыі, 2015; карткі-заданні, мультымедыйная прэзентацыя “Беларусь у малюнках Напалеона Орды. Другая палова XIX стагоддзя”; фотаздымак Напалеона Орды, ілюстрацыя “Помнік Н.Ордзе ў Іванаве”, музыка Н.Орды (“Паланэз”, “Накцюрн”).

***Эпіграф:*** **Хто хоць жменяй зямлю насіць,**
**Той узвядзе гару.**
***Н.Орда***

***Ход урока***

**І. Арганізацыйны момант.**

**1. Стварэнне эмацыянальнага настрою.**

*Гучыць “Паланэз” Напалеона Орды.*

**Настаўнік.** Праслухайце біяграфію вядомага вам чалавека. Скажыце, калі ласка, пра каго ідзе размова?

Ён нарадзіўся 11 лютага 1807 года ў радавым маёнтку ў сям'і кобрынскага маршалка, інжынера-фартыфікатара. Пачатковую адукацыю атрымаў у бацькоўскай хаце, у 12 гадоў працягнуў вучобу ў Свіслацкай гімназіі, вучыўся ў Віленскім універсітэце. Прымаў удзел у паўстанні 1830-1831 гг. Некаторы час жыў у Парыжы. У 1856 г. вярнуўся на радзіму. Памёр у 76-гадовым узросце ў Варшаве. Паводле завяшчання быў пахаваны ў радавым магільным склепе. *(Напалеон Орда)*

Я думаю, што гэтая цудоўная музыка Напалеона Орды паспрыяе добраму настрою і плённай працы на ўроку. Зачытайце эпіграф нашага ўрока, як вы яго разумееце? *(Адказы вучняў)*

**II. Паведамленне тэмы ўрока, паўтарэнне вывучанага.**

**Настаўнік.** На ўроку мы будзем гаварыць не толькі пра Н.Орду. Тэма нашага ўрока – злучальныя і падпарадкавальныя злучнікі, іх ужыванне. Давайце ўспомнім матэрыял мінулых урокаў. Знайдзіце правільныя сцвярджэнні:

а) Злучнік – самастойная часціна мовы.
б) Злучнік злучае часткі складанага сказа.
в) Злучнік злучае аднародныя члены сказа.
г) Злучнік – зменная часціна мовы.
д) Злучнік з’яўляецца членам сказа.
е) Паводле структуры злучнікі бываюць простыя і састаўныя.
ё) У залежнасці ад спосабу ўжывання злучнікі падзяляюцца на адзіночныя, парныя і паўторныя.

**Адказ:** б, в, е, ё

**Узаемаправерка выкананага. Карэкцыя адказаў.**

**III. Вывучэнне і замацаванне новага матэрыялу.**

**1.Вырашэнне праблемнай сітуацыі.**
**Настаўнік.** Разгледзьце табліцу 1.

**Табліца 1. Злучальныя і падпарадкавальныя злучнікі**

| Злучальныя злучнікі звязваюць | Падпарадкавальныя злучнікі звязваюць |
|---|---|
| - аднародныя члены сказа,<br>- часткі тэксту,<br>- раўнапраўныя па сэнсе часткі складанага сказа, які называецца складаназлучаным | - часткі тэксту,<br>- часткі ў складаным сказе, які называецца складаназалежным. У такім сказе адна частка залежыць ад другой, гэта значыць, ад адной часткі сказа можна паставіць пытанне да другой |

**Настаўнік.** Ці правільна пабудаваны сказы: “Аляксандр II у 1856 годзе аб’явіў амністыю для ўдзельнікаў паўстання, і Напалеон Орда змог вярнуцца на Радзіму”; “Напалеон Орда змог вярнуцца на Радзіму, бо Аляксандр II у 1856 годзе аб’явіў амністыю для ўдзельнікаў паўстання”?

- Часткі якіх сказаў злучаюць злучнікі “і”, “бо”? Чым адрозніваюцца гэтыя сказы паміж сабой? *(Адказы вучняў)*

- Якія адносіны паміж часткамі сказа перадаюць злучнікі “і”, “бо”? *(Паслядоўнасць дзеянняў, падзей; залежнасць адной падзеі ад другой).*

**2. Выкананне практыкавання.**

**Настаўнік.** Прачытайце тэкст у адпаведнасці з нормамі літаратурнага маўлення. Дайце загаловак тэксту. Вызначце яго стыль. Растлумачце, якія моўныя сродкі (словы, часціны мовы, сказы) дапамаглі зрабіць патрэбны вывад. Назавіце злучальныя і падпарадкавальныя злучнікі ў тэксце. Што яны звязваюць?

Напалеон шмат падарожнічаў па Беларусі, Украіне, Літве і Польшчы і рабіў замалёўкі мясцін, звязаных з жыццём вядомых людзей, а таксама архітэктурных помнікаў. Таму яго творы вызначаюцца строгай дакументальнасцю і служаць каштоўнай крыніцай для гісторыкаў архітэктуры і рэстаўратараў. Тым больш што ў наш час шматлікія аб’екты, адлюстраваныя мастаком, ужо не існуюць або значна відазмяніліся. Значная калекцыя літаграфій з малюнкаў Н.Орды змешчана ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, але большая частка работ земляка (977 твораў) знаходзіцца ў Нацыянальным музеі Кракава (Польшча), у народным музеі ў Варшаве. Альбом акварэляў таксама ёсць у бібліятэцы В.Стафаніка ў Львове (Украіна).

**3. Работа з табліцамі (па варыянтах).**

**Настаўнік.** *І варыянт.* Азнаёмцеся з табліцай 2. Зрабіце вуснае паведамленне на аснове табліцы і пытанняў карткі № 1.

**Табліца 2. Злучальныя злучнікі**

| спалучальныя | супрацiўныя | размеркавальныя |
|---|---|---|
| і, ды (і), і-і, ні-ні, як-так і, не толькі- але і | а, але, ды (але), аднак, затое, хоць (хоць і) – але | ці, ці-ці, або-або, альбо-альбо, то-то, ці то- ці то, не то – не то |
| Спалучаюць і аднародныя члены сказа, і раўнапраўныя па сэнсе часткі складаназлучанага сказа, якія паказваюць, што дзеянні (падзеі, з’явы) адбываюцца адначасова або паслядоўна – адно за другім | Звязваюць аднародныя члены і раўнапраўныя па сэнсе часткі складаназлучанага сказа з супрацiўным значэннем. **Адрознівайце** спалучальны злучнік ***“затое”*** ад спалучэння прыназоўніка ***“за”*** і займенніка ***“тое”,*** якія пішуцца ў сказе асобна, – ***“за тое”*** | Злучаюць аднародныя члены і раўнапраўныя па сэнсе часткі складаназлучанага сказа, якія паказваюць на магчымасць толькі аднаго дзеяння (падзеі, з’явы, прадмета) з двух або некалькіх ці на чаргаванне дзеянняў (падзей, з’яў, прадметаў) |
| Перад злучнікамі, якія спалучаюць часткі складанага сказа, ставіцца коска!!! | | |

| КАРТКА №1 |
| --- |
| 1. На якія віды па значэнні падзяляюцца злучальныя злучнікі? |
| 2. Якая роля злучальных злучнікаў? |
| 3. Назавіце спалучальныя злучнікі, іх сінтаксічную ролю. Складзіце з імі сказы. |
| 4. Назавіце супраціўныя злучнікі. Складзіце з імі сказы. |
| 5. Назавіце размеркавальныя злучнікі. Складзіце з імі сказы. |

**Настаўнік.** *II варыянт.* Азнаёмцеся з таблiцай 3. Складзiце вуснае паведамленне на аснове табліцы і пытанняў карткі № 2.

**Табліца 3. Падпарадкавальныя злучнікі**

| | | |
| --- | --- | --- |
| часавыя | калі, як, пакуль, ледзь, чуць, толькі, як толькі і інш. | звязваюць такія часткі складаназалежнага сказа, якія паказваюць на час, прычыну, мэту і ўмову таго, пра што гаворыцца ў галоўнай частцы |
| прычынныя | бо, што, таму што, з прычыны таго што і інш. | |
| мэтавыя | каб, для таго каб, з тым каб і інш. | |
| умоўныя | калі (б), каб, з тым каб і інш. | |
| параўнальныя | як, нібы, бы, быццам, што і інш. | звязваюць такія часткі складаназалежнага сказа, якія шляхам параўнання характарызуюць тое, пра што паведамляецца ў галоўнай частцы |
| тлумачальныя | што, як, каб і інш. | звязваюць такія часткі складаназалежнага сказа, дзе тлумачыцца, раскрываецца сэнс якога-небудзь члена галоўнай часткі |

| Картка № 2 |
| --- |
| 1. На якія віды падзяляюцца падпарадкавальныя злучнікі па значэнні? |
| 2. Якая роля падпарадкавальных злучнікаў? |
| 3. Назавіце часавыя (мэтавыя, прычынныя, умоўныя, параўнальныя, тлумачальныя) злучнікі. Прывядзіце прыклады. |

**Аналіз і ўзаемаацэнка паведамленняў.**

**4. Калектыўны пераклад тэксту.**

**Настаўнік.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову, запішыце яго. Падкрэсліце злучнікі, вызначце іх разрад і від па значэнні.

1098 объектов материальной культуры разных стран Европы увековечил в своих акварелях и литографиях Н.Орда – мастер архитектурного пейзажа, написал около 50 музыкальных произведений и стал автором одного из первых пособий по теории и гармонии музыки «Грамматика музыки», написал учебник польского языка будучи в эмиграции во Франции, был успешным публицистом своего времени, ярким и востребованным преподавателем музыки.

**5.Праца ў групах (дзве групы)**

*1-я група.*

**Настаўнік.** Спішыце тэкст, расстаўляючы прапушчаныя знакі прыпынку. Падкрэсліце злучальныя злучнікі адной рыскай, падпарадкавальныя – дзвюма. Вызначце від злучнікаў па значэнні.

…Няхай паляк не адрачэцца
Ліцвіна прызнаваць за брата.
Іх рукі разам скінуць краты
Каб волю адчыніць для сэрцаў.
Яшчэ нам Жыгімонг казаў
Жыць вечна ў міры да суседа
Каб нас не закраналі беды
І недавер не раз’ яднаў.
А за Айчыну станем біцца –
Дзвіна між нас не перашкода.
І заблішчыць святло свабоды
Што адняла калісь царыца. *(Н.Орда “Ліцвін да паляка”)*

*2-я група.*

**Настаўнік.** Прачытайце выразна верш А.Крэйдзіча, вызначце асноўную думку яго. Выпішыце сказы са злучнікамі, назавіце, да якога віду яны адносяцца, і вызначце іх ролю ў тэксце.

Дырэктар оперы ў Парыжы,
Паўстанец слаўны і мастак…
Хоць жыў ты болей у замежжы,
Ды не француз і не паляк.
Сваіх герояў мы не зналі,
Ўсё больш чужым паклоны білі.
Пакуль відушчымі не сталі,
Пакуль трывогу не забілі.
Тады з выгнання – занядбання
Герой героем к нам вярнуўся:
У бронзе выліт. Спадзяваннем
Прыйшоў час явай разгарнуцца.
Калі цяпер у нас спытаюць:
Чаго мы варты? Што мы маем?
Няхай у свеце цэлым знаюць,
Што й мы герояў нараджаем.

Што хай чужым спяваем оды,
Ўсё ж сваіх найбольш шануем.
Свой кут завём мясцінай Орды,
Ягоным імем дух гартуем. *(А.Крэйдзіч “Палескі Напалеон”)*

**6. Індывідуальная праца (два вучні).**

**Настаўнік.** Напішыце сачыненне на вызначаную тэму, ужываючы злучальныя і падпарадкавальныя злучнікі.

1) Сачыненне-апісанне па малюнку (ілюстрацыя помніка Н.Ордзе ў г.Іванава) (Дадатак 1).

2. Сачыненне-апавяданне “Мой славуты зямляк” (Дадатак 2).

**IV. Рэфлексія.**

- Прыгадайце, якія задачы вы ставілі перад сабой у пачатку ўрока? Як вы лічыце, ці ўдалося вам іх вырашыць?

- Для чаго патрэбна ведаць злучальныя і падпарадкавальныя злучнікі?

**V. Падвядзенне вынікаў урока, выстаўленне адзнак, каментарый выстаўленых адзнак.**

**VI. Дамашняе заданне**.

1) § 40, практ. 288.

2) Напісаць сачыненне “У музеі” на аснове ўражанняў ад наведвання музея Напалеона Орды *(па жаданні).*

**Настаўнік.** Хачу адзначыць, што вы сёння плённа папрацавалі на ўроку, атрымалі шмат добрых адзнак. А цяпер мы з вамі адпачнём.

Прэзентацыя “Беларусь у малюнках Напалеона Орды. Другая палова XIX стагоддзя”.

У час прагляду гучыць “Накцюрн” Н.Орды.

**Дадатак 1.**



**Дадатак 2.**

## Сачыненне “Мой славуты зямляк”

Усяму адукаванаму свету вядома назва нашай невялікай вёсачкі Варацэвічы. Менавіта тут, у радавым маёнтку, 11 лютага 1807 года з’явіўся на свет геніяльны дзеяч палескай культуры: таленавіты тэарэтык музыкі, кампазітар і піяніст, мастак, гісторык, краявед.

На хутары выла завея,
Вакол замялі ўсё снягі.
Царыла мяцеліца фея,
Хлапчук нарадзіўся нагі.
І бацька назваў яго Орда
І дзіўна неяк – Напалеон
Не для служакі ў лорды,
Каб людзям дарыў шчасце ён.

Напалеон Орда пакінуў нам у спадчыну многа архітэктурных замалёвак. Значная колькасць іх у наш час мае не толькі мастацкае, але і навукова-пазнавальнае значэнне. Мы маем магчымасць убачыць шмат помнікаў архітэктуры, якія не збераглісяя або пазней былі грунтоўна перабудаваны.

Мэта Орды быць патрэбным людзям збылася. Цяпер яго імя ведаюць ва ўсім свеце. Перш за ўсё гэта быў сумленны чалавек, патрыёт, які вельмі любіў свой край. Імя Напалеона не толькі ведаюць, але і шануюць на яго радзіме. Аб гэтым сведчыць адкрыццё карціннай галерэі, музейнага комплексу Н.Орды ў нашай вёсцы.

Я ганаруся, што жыву на зямлі, якая дала свету гэтага таленавітага чалавека. Я лічу, што кожны з нас павінен жыць, тварыць і працаваць пад дэвізам Н.Орды: “Хто хоць жменяй зямлю носіць, той узвядзе гару”.

Яго не забудзем ніколі,
Бо Слава і Гонар наш ён.
Я выйду ў вясенняе поле
І выгукну”Напалеон!”
Мне рэха ў адказ адгукнецца.
Мой голас падхопіць зямля.
Няхай назаўсёды застанецца
У сэрцы святое імя.

***Саковіч Ганна***